ДЭПАРТАМЕНТ ПА АРХІВАХ І СПРАВАВОДСТВУ
МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ АРХІЎ БЕЛАРУСІ

# Гербоўнік беларускай шляхты

ТОМ 6

## Е Ё Ж

Мінск
«Беларусь»
2020

УДК 929.5/.6(476)
ББК 63.2(4 Беи)
Г37

Рэкамендавана да друку Вучоным саветам
Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі

А ў т а р ы:
*Я. С. Глінскі* (кіраўнік), *Д. Ч. Матвейчык*, *Ю. М. Снапкоўскі*

Н а в у к о в ы р э д а к т а р:
прафесар, доктар габілітаваны *А. Рахуба*

Р э д к а л е г і я:
*Д. У. Яцэвіч* (старшыня), *Р. С. Жаўняркевіч*,
*В. І. Кураш*, *Д. В. Лісейчыкаў*, *А. Я. Рыбакоў*

Р э ц э н з е н т ы:
доктар гістарычных навук *В. Ф. Голубеў*,
кандыдат гістарычных навук *В. С. Макарэвіч*

*Выпуск выдання ажыццёўлены па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь*

**Гербоўнік беларускай шляхты.** Т. 6. Е, Ё, Ж / Я. Глінскі [і інш.];
Г37 навук. рэд. А. Рахуба. — Мінск : Беларусь, 2020. — 543 с. : [24] л. іл.
ISBN 978-985-01-1345-0.

Кніга – працяг шматтомнага выдання, распачатага ў 2002 г. У шостым томе «Гербоўніка беларускай шляхты» пададзены 103 радаводы шляхты пераважна Мінскай губерні з прозвішчамі на літары «Е», «Ё», «Ж», складзеныя на падставе матэрыялаў фонду Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу.

Прызначаецца для шырокага кола чытачоў – прафесійных навукоўцаў, а таксама аматараў генеалогіі і геральдыкі, краязнаўцаў і ўсіх тых, хто цікавіцца гісторыяй.

**УДК 929.5/.6(476)**
**ББК 63.2(4 Беи)**

**ISBN 978-985-01-1345-0**

© Дзяржаўная ўстанова «Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі», 2020
© Афармленне. РУП «Выдавецтва «Беларусь», 2020

# ПРАДМОВА

У 2018 г. **Нацыянальным гістарычным архівам Беларусі** сумесна з **выдавецтвам «Беларусь»** выпушчаны пяты том «Гербоўніка беларускай шляхты» (далей – «Гербоўнік»), у які былі ўключаны радаводы шляхты, якая пераважна пражывала на тэрыторыі Мінскай губерні і мела прозвішчы, што пачыналіся на літару «Д». Том выклікаў вялікую цікавасць навуковай грамадскасці, а таксама аматараў гісторыі ў цэлым. Матэрыялы, змешчаныя як у ім, так і ў папярэдніх тамах, аказваюць дапамогу пры правядзенні разнастайных гістарычных і генеалагічных даследаванняў.

Традыцыйнай часткай дапаможнага матэрыялу «Гербоўніка» з'яўляюцца агляды айчынных навуковых прац, прысвечаных праблеме гісторыі шляхецкага саслоўя на беларускіх землях. Як адзначалася ў папярэдніх тамах, колькасць падобных даследаванняў павялічваецца фактычна з кожным годам. Таксама назіраецца пашырэнне праблемнага поля, з'яўленне новых тэматычных блокаў. У выніку за непрацяглы перыяд (ад часу напісання прадмовы да пятага тома) пабачыла свет немалая колькасць адпаведных навуковых даследаванняў. З адносна новых тэндэнцый неабходна адзначыць узрастанне цікавасці да аналізу гістарыяграфічных інтэрпрэтацый мінуўшчыны шляхты[1]. Што датычыцца магістральных напрамкаў беларускай гістарыяграфіі, то ўвагу навукоўцаў па-ранейшаму прыцягваюць такія праблемы, як удзел шляхты беларускіх зямель у палітычным і эканамічным жыцці Полацкага княства, Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай[2], грамадска-палітычнае і сацыяльна-эканамічнае становішча шляхты ў складзе Расійскай імперыі[3], матэрыяльная і духоўная культура шляхецкага саслоўя[4], гісторыя асобных шляхецкіх родаў, іх найбольш значных прадстаўнікоў, лакальных шляхецкіх супольнасцей[5].

Прыведзены агляд толькі беларускай гістарыяграфіі паказвае, што выданне наступных тамоў «Гербоўніка» з'яўляецца вельмі актуальным для айчыннай гістарычнай навукі з прычыны сваёй фактаграфічнай насычанасці і ўвядзення ва ўжытак вялікай колькасці звестак, узятых непасрэдна з архіўных матэрыялаў (пры абавязковай іх крытычнай апрацоўцы). Можна ўпэўнена сцвярджаць, што як прафесійныя навукоўцы, так і даследчыкі-аматары будуць яшчэ не раз звяртацца да яго ў сваёй дзейнасці.

* * *

У прадмовах да папярэдніх тамоў «Гербоўніка» звярталася ўвага на праблему наяўнасці ў дваранскіх справах сфальсіфікаваных дакументаў і звестак, былі акрэслены іх віды, апісаны прыкметы падробак і спосабы

іх выяўлення[6]. Яшчэ адным момантам, які ўскладняе працу з масівам генеалагічных даных з фондаў дваранскіх дэпутацкіх сходаў (далей – ДДС) з'яўляецца прысутнасць у вывадах (у т. л. ранніх) звестак, якія тычыліся іншых родаў, звязаных з падаўцамі дакументаў толькі агульным прозвішчам.

Такі варыянт доказу дваранства актыўна выкарыстоўваўся родамі, якія не мелі на руках істотнага комплексу фамільных папер. Перш за ўсё да іх адносіліся былыя зямяне і баяры, якія не валодалі маёнткамі, а пражывалі на землях, атрыманых за службу (ваенную ці гаспадарчую) буйным землеўласнікам. Найбольш распаўсюджаным выпадкам выкарыстання чужых звестак была апеляцыя да аднаго або некалькіх выпісаў, узятых у канцы XVIII – пачатку XIX ст. пераважна з кніг мінскіх земскага або гродскага судоў, а таксама Мінскай кадэнцыі Галоўнага Трыбунала ВКЛ. Верагодна, ужо ў гэты перыяд ажыццяўлялася мэтанакіраваная дзейнасць па праглядзе судовых кніг з мэтай адшукання актаў, якія б пасавалі для падачы ў ДДС[7]. Зянковічы, якія пражывалі ў засценку Падсадскія маёнтка Магільна Ігуменскага павета і засценку Качановічы Нясвіжскага княства Слуцкага павета ў двух вывадах ад 1804 г.[8], абапіраліся на выпісы з мінскіх судоў, паводле якіх іх продкамі выстаўляліся шляхціцы, якія ў другой палове XVII – першай палове XVIII ст. валодалі землямі ў Мсціслаўскім ваяводстве. У рэчаіснасці, аднак, Зянковічы ўжо ў той час пражывалі ў маёнтку Магільна, насілі прозвішча ў форме «Занкевіч» і выконвалі не толькі зямянскія, але нават мяшчанскія павіннасці[9]. Яшчэ адны былыя магільнянскія мяшчане Туміловічы (Таміловічы), якія дасягнулі зямянскага статусу толькі ў канцы XVII – пачатку XVIII ст. і былі пракаветнымі жыхарамі маёнтка Магільна[10], у 1802 г. называлі пачынальнікам роду шляхціца з Гродзенскай эканоміі[11].

Зварот да гісторыі і дакументаў іншых родаў патрабаваўся не толькі нашчадкам мяшчан і сялян, якія з цягам часу апынуліся ў складзе асобных зямянскіх супольнасцей, але і старадаўнім прадстаўнікам гэтага сацыяльнага стану. Суседзі Зянковічаў і Туміловічаў па маёнтку Магільна Шчасновічы (Шчансновічы) належалі да мясцовых зямян з канца XVI ст.[12], але падчас «разбору шляхты» грунтоўных дакументаў, якія б пацвярджалі іх паходжанне, не мелі (ці не палічылі іх дастатковымі) і выводзілі сябе ад уладальніка маёнтка Гердуцішкі Мінскага павета Юзафа Шчасновіча, які ў 1737 г. унёс у Мінскі гродскі суд маніфест аб знішчэнні маёмасці пажарам[13]. Паўловічы былі зямянамі маёнтка Старыца Капыльскага княства (у XIX ст. – у Ігуменскім павеце) ужо паводле інвентара ад 1646 г.[14] і працягвалі там жыць да пачатку XIX ст., але ў 1815 г. яны выводзілі сябе ад асоб, якія ў XVII–XVIII стст. адносіліся да шляхецкай супольнасці Ваўкавыскага і Слонімскага паветаў[15].

У іншых выпадках да генеалагічнай схемы роду далучалася некалькі не звязаных з ім пакаленняў людзей. Есьманы з фальварка Дзярэчына Слуцкага павета ў XVIII ст. былі баярамі і зямянамі[16], але ў 1802 г. яны дапасавалі сябе да даволі заможнага роду з Полацкага і Навагрудскага ваяводстваў, а ў якасці свайго непасрэднага продка называлі полацкага гараднічага Уладзіслава Есьмана[17], што, безумоўна, не адпавядала рэчаіснасці. Відавочна, што за аснову ранняга фіктыўнага радаводу дзярэчынскіх Есьманаў быў узяты вывад ад 1799 г., ажыццёўлены ў Літоўскім ДДС навагрудскімі Есьманамі[18], – абодва яны змяшчаюць амаль аднолькавы пералік членаў першых пяці пакаленняў. Яшчэ адзін баярскі род – Цераховічы з маёнткаў Цялядавічы і Вялешына Нясвіжскага жаночага бенедыкцінскага кляштара (тэрытарыяльна знаходзіліся ў Слуцкім павеце) – выкарыстаў схему ранніх пакаленняў (за сярэдзіну XV – першую палову XVIII ст.) дробнашляхецкага роду таго ж самага прозвішча з ваколіцы Омневічы Навагрудскага павета[19]. Абодва выпадкі дастаткова паказальныя. Гэтыя баярскія роды не валодалі ніякімі дакументамі, якія б увогуле маглі падмацаваць іх прэтэнзіі на шляхецтва[20], што прымушала атаясамліваць сябе з зусім іншымі родамі. Тое ж датычыцца нашчадкаў мяшчан Жагалковічаў[21] з Ігуменскага павета. Не маючы ўласных дакументаў, яны ўпісалі ў сваю генеалагічную схему звесткі пра раннія пакаленні роду Жалкоўскіх, які жыў у Віленскай губерні[22], што, сярод іншага, прывяло да трансфармацыі іх прозвішча.

Шэраг родаў з Дзісенскага павета (напрыклад, Заблоцкія, Зянкевічы, Ігнатовічы[23]) выкарыстоўвалі вывады, што рабіліся ў Віцебскім ДДС людзьмі з такімі самымі прозвішчамі, якія пераважна пражывалі ў Невельскім і Себежскім паветах. У дачыненні да такіх судалучэнняў нельга ўпэўнена адкінуць магчымасць супольнага паходжання, але, верагодна, яно дакладна не было такім, як паказана ў дваранскіх справах.

Некаторыя прадстаўнікі дробнашляхецкага асяроддзя звярталіся да даволі складаных маніпуляцый у працэсе прыўлашчвання сабе дакументаў іншых родаў. Яшчэ адны шляхціцы з Дзісеншчыны – Жаўняровічы – падчас вывада шляхецтва ў 1815 г., апрача выпісаў з метрычных кніг, мелі на руках толькі нешматлікія кантракты (пераважна за перыяд канца XVIII – пачатку XIX ст.) на арэнду зямлі. Затое яны нейкім чынам атрымалі дакумент ад 1660 г. (у выпісе з Ашмянскага гродскага суда), у якім адзначалася, што род валодаў маёнткамі ў Смаленскім ваяводстве[24]. Аднак у рэчаіснасці гэты дакумент тычыўся вядомага роду Лавейкаў, а прозвішча «Жаўняровіч» было папросту інтэрпалявана ў тэкст.

Апрача зямян і баяр, спробы выкарыстаць чужыя радаводы для ўваходжання ў шляхецкую супольнасць рабілі таксама прадстаўнікі сялянскага саслоўя. Паводле інвентароў ад 1803 і 1809 гг., сярод цяглых сялян вёскі

Лотвіны Слуцкага павета (уласнасці вышэйзгаданага Нясвіжскага жаночага бенедыкцінскага кляштара) былі паказаны носьбіты прозвішча Жылка[25]. У сваю чаргу ў 1824 г. яны, змяніўшы прозвішча на «Жылінскія», спрабавалі паказаць сябе часткай аднайменнага зямянскага роду, які атрымаў прызнанне ў дваранстве ў 1802 г.[26] Аднак дадзеная спроба скончылася няўдачай – ДДС не прыняў іх дакументы да разгляду.

Неабходна адзначыць, што зямянам патрабавалася пацвярджаць сваю станавую прыналежнасць не толькі пасля ўваходжання беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі. Яшчэ ў XVII–XVIII стст., апрача характэрных для ўсяго шляхецкага саслоўя працэсаў аб «нагане шляхецтва», зямяне вымушаны былі падаваць доказы высакароднага паходжання на разгляд адміністрацыі маёнткаў, у якіх яны пражывалі[27]. Такія абставіны таксама правакавалі магчымыя маніпуляцыі з радаводам. У 1721 г. слуцкія зямяне Яновічы апелявалі да пацвярджальнага прывілея Жыгімонта I ад 3 верасня 1532 г., дадзенага гаспадарскаму маршалку, ваўкавыскаму і мерацкаму дзяржаўцы Мацею Войцехавічу Янавічу, якога выстаўлялі сваім продкам. Аднак у рэчаіснасці адрасатам прывілея быў прадстаўнік вядомага панскага роду Клочкаў, у будучым віцебскі ваявода і жамойцкі староста, які не меў сыноў, а адзінай яго спадчынніцай стала дачка Марына[28]. Апрача таго, у канцы XVIII ст. дастаткова пашыранай з'явай (прынамсі, у зямянскім асяроддзі радзівілаўскіх уладанняў на гістарычнай Случчыне) стала ўпісанне ў актавыя кнігі прывілеяў, нібыта дадзеных ад імя каралёў польскіх і вялікіх князёў літоўскіх. У гэтым кантэксце выклікаюць цікавасць фальсіфікаты ад імя загадкавага ўладара Уладзіслава III. Яны пераважна датаваны першай трэццю XV ст. (калі манархам быў Уладзіслаў II Ягайла), але ў якасці падканцлера ў іх пазначаны Стэфан Пац, які займаў гэты ўрад у 1635–1640 гг. (гэта значыць, у панаванне Уладзіслава IV Вазы)[29]. Яшчэ большым змяшэннем рэалій розных эпох вылучаецца фальсіфікат зямян Васілеўскіх[30]. Ён дадзены 15 ліпеня 1424 г. пад Варнай (такім чынам, гэта адсылка да бітвы пад Варнай, у якой у 1444 г. загінуў сапраўдны Уладзіслаў III), але падпісаны «пісарам Вялікага Княства Літоўскага» Львом Сапегам (!).

Нават не ўлічваючы крайне невысокую якасць падробак, створаных у канцы XVIII ст., іх звесткі звычайна лёгка правяраюцца і адкідваюцца на падставе незалежных крыніц. У 1793 г. зямяне Машчыцкія падавалі прывілей Жыгімонта III ад 1602 г. іх уяўнаму продку Іаахіму Машчыцкаму, які нібыта быў каралеўскім дваранінам, таварышам панцырнай харугвы і вылучыўся ў вайне са шведамі[31]. У рэчаіснасці ў гэты час (як і ў канцы XVIII ст.) Машчыцкія пражывалі ў Слуцкім княстве і знаходзіліся на зямянскай павіннасці[32]. У некаторых выпадках несапраўднасць падобных дакументаў была раскрыта ўжо ў XIX ст. Напрыклад, Шуневічы-Жыцкія падалі ў 1793 г. на актыкацыю

ў Случарэскі гродскі суд прывілей на маёнтак Жыцкае, нібыта выдадзены іх продку ў 1528 г. князямі Юрыем і Сямёнам Юр'евічамі Алелькавічамі[33]. Апрача анахранічнага почырку і тэрміналогіі (Жыцкае было акрэслена як «фальварак»), змест дакумента не вытрымлівае ніякай крытыкі. У 1528 г. яшчэ жывы быў бацька Юрыя і Сямёна – князь Юрый[34], які і мусіў бы выдаць падобны акт, калі б ён быў сапраўдны. Пры гэтым захаваўся «арыгінал» дакумента, на якім ужо ў XIX ст. была зроблена пазнака (верагодна, радзівілаўскімі архівістамі) пра яго фальшывасць[35]. Прывілеі, выробленыя ў канцы XVIII ст., траплялі і ў поле зроку расійскіх улад. У 1851 г. праводзілася следства аб сфальсіфікаваным прывілеі Жыгімонта III ад 1596 г. на Ваўкавыскае староства, нібыта дадзеным продку зямянскага роду Гаўрыковічаў (Гаўрыкаў) з засценка Клешаў Слуцкага павета[36].

Калі выяўленне і адасабленне дробнашляхецкіх фальсіфікатаў канца XVIII ст. не выклікае сур'ёзных цяжкасцей, то вышэйзгаданыя выпадкі выкарыстання асобных сапраўдных дакументаў іншых родаў і нават дапасавання да чужых радаводаў патрабуюць пільнай увагі. Дастаткова выразным паказчыкам падобных маніпуляцый з генеалагічнай схемай з'яўляюцца істотныя адрозненні паміж месцамі пражывання, грамадскім і эканамічным статусам зямян і тых асоб, ад якіх яны імкнуліся вывесціся. Таксама варта звяртаць увагу на час атрымання выпісаў, якія тычыліся несапраўдных продкаў родаў. Выклікаць сумненні павінны дакументы, атрыманыя з судовых канцылярый у канцы XVIII – пачатку XIX ст., незадоўга да падачы дакументаў на разгляд ДДС.

* * *

У 2017–2019 гг. у Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі працягвалася распрацоўка планавай навуковай тэмы «Генеалогія і геральдыка шляхецкіх родаў Беларусі», адным з вынікаў ажыццяўлення якой стала падрыхтоўка дадзенага тома «Гербоўніка». Ён ахоплівае радаводы шляхты пераважна Мінскай губерні, чые прозвішчы пачынаюцца на літары «Е», «Ё», «Ж», і змяшчае 103 артыкулы. Як і ў папярэдніх тамах, у яго ўключаны і тыя роды, што маюць падвойнае прозвішча, асноўная частка якога пачынаецца на вышэйзгаданыя літары – «Глябовічы-Есьманы», «Наркевічы-Ёдкі», «Пяткевічы-Ёдкі», «Гатартовічы-Жахоўскія», «Крукоўскія-Ждановічы», «Міткевічы-Жоўткі», «Барташэвічы-Жукі», «Контвіды-Жукоўскія», «Крыжан-Жухавецкія». Традыцыйна ў том не ўключаліся тыя роды, у якіх з літар «Е», «Ё», «Ж» пачынаўся толькі прыдомак – «Гурыновічы-Ждановічы», «Жуяртоўскія-Маркіяновічы», «Еўлашкевічы-Мянюткі», «Жабкі-Патаповічы».

Артыкулы, уключаныя ў гэты том, напісаны паводле той жа схемы, што была выкарыстана ў папярэдніх тамах, і складаюцца з пяці частак:

1) прозвішча роду, магчымы прыдомак, герб;

2) звесткі пра легенды аб паходжанні роду або найбольш старажытных вядомых прадстаўнікоў;

3) пакаленны роспіс, створаны на падставе матэрыялаў, пададзеных у Мінскі ДДС;

4) звесткі пра зацвярджэнне ці незацвярджэнне роду ў расійскім дваранстве ўказамі Сената;

5) крыніцы, на падставе якіх напісаны артыкул.

Апрача таго, вялікая ўвага надаецца ўключэнню ў артыкулы звестак пра тых асоб, чые дакументы маюцца ў справах аб дваранскім паходжанні таго ці іншага роду, аднак іх сваяцкія сувязі з ім не ўдаецца вызначыць. Артыкулы змяшчаюць дастаткова падрабязныя каментарыі, куды выносяцца звесткі пра сумнеўныя і сфальсіфікаваныя дакументы (на што звяртаецца асаблівая ўвага), аўтарскія заўвагі і тлумачэнні наконт асаблівасцей канкрэтных радаводаў.

Падставай для напісання шостага тома па-ранейшаму з’яўляюцца справы фонду Мінскага ДДС (ф. 319, вопісы 1 і 2). Звесткі, змешчаныя ў іх, пры неабходнасці маглі дапаўняцца іншымі матэрыяламі (архіўнымі і апублікаванымі дакументамі, навуковай літаратурай), калі яны меліся ў таго ці іншага аўтара падчас напісання артыкула. Аднак пошук гэтых дадатковых матэрыялаў у якасці асобнай задачы не ставіўся і не ставіцца. Не варта забывацца, што справы аб дваранскім паходжанні не з’яўляюцца адзінымі крыніцамі па гісторыі шляхецкіх родаў Беларусі. Кола гэтых крыніц вельмі вялікае. Таму абсалютызацыя прынцыпу ўсеагульнасці крыніц для напісання таго ці іншага артыкула вяла б да бясконцага расцягвання выхаду нават аднаго тома «Гербоўніка» і зрабіла б яго выданне немагчымым.

Шосты том, як і папярэднія, забяспечаны паказальнікамі імёнаў і геаграфічных назваў. Да яго дадаюцца таксама каляровыя выявы пэўнай часткі гербаў шляхецкіх родаў, якія маюцца ў матэрыялах фонду (у справах аб паходжанні асобных родаў і кнігах вывадовых пратаколаў), і асобныя генеалагічныя табліцы. Змяшчэнне ўсіх наяўных гербаў і генеалагічных табліц, на жаль, немагчымае з прычыны абмежаванага аб’ёму тома і памераў некаторых з іх. Паколькі дзякуючы сучасным інфармацыйным тэхналогіям выявы гербаў сталі лёгкадаступнымі для даследчыкаў, у гэты том уключаны толькі тыя выявы, якія змешчаны ў дакументах самімі прадстаўнікамі роду, нават калі малюнкі выкананы на дастаткова прымітыўным узроўні.

У гэтым томе, як і ў папярэдніх, пазначэнне адміністрацыйна-тэрытарыяльнай прыналежнасці населеных пунктаў здзейснена наступным чынам. У выпадку, калі звесткі тычацца перыяду Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, пазначаецца толькі павет або ваяводства (напрыклад, Пінскі пав., Мінскае ваяв. і да т. п.). Калі ж звесткі адносяцца да перыяду Расійскай імперыі, указваецца як павет, так і губерня (напрыклад, Пінскі пав. Мінскай губ., Ашмянскі пав. Віленскай губ. і да т. п.).

Аўтарскі калектыў выказвае шчырую падзяку ўсім, хто дапамагаў пры складанні гэтай кнігі: дырэктару Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі Дзмітрыю Уладзіміравічу Яцэвічу за арганізацыйную дапамогу ў выданні, а таксама ўсім супрацоўнікам архіва, што мелі дачыненне да падрыхтоўкі тома.

**Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі** працягвае працу па складанні чарговых тамоў «Гербоўніка». Наступным рыхтуецца том, куды будуць уключаны 225 артыкулаў з радаводнымі роспісамі шляхты (зноў пераважна Мінскай губерні), чые прозвішчы пачынаюцца на літары «З» і «І».

---

[1] *Андруцкая, Т. В.* Изучение практики дворянского самоуправления в современной российской исторической науке // «Долгий XIX век» в истории Беларуси и Восточной Европы: исследования по Новой и Новейшей истории: сб. науч. тр. – Вып. 1. – Минск: РИВШ, 2017. – С. 148–156; *Жытко, А. П., Куцко, К. Г.* Вышэйшае саслоўе Беларусі (1785–1914 гг.): гістарыяграфія праблемы // Весці БДПУ. Серыя 2. – 2017. – № 2. – С. 11–16; *Караленак, У. У.* Гістарыяграфія Нясвіжскай ардынацыі Радзівілаў // Научные труды Республиканского института высшей школы. – Вып. 18. – Ч. 1. – Минск: РИВШ, 2018. – С. 169–179; *Ковшик, Ю. Л.* Дворянство Беларуси в системе местных органов управления (1772–1914 гг.): историография проблемы // Гістарыяграфія і крыніцы вывучэння гісторыі Беларусі: традыцыі і навацыі: зборнік навуковых артыкулаў. – Мінск: Беларуская навука, 2018. – С. 101–112; *Козловская, Н. В.* Шляхта Великого Княжества Литовского XIV–XVI вв. в современной белорусской историографии // Научные труды Республиканского института высшей школы. – Вып. 19. – Ч. 1. – Минск: РИВШ, 2019. – С. 190–200; *Ее же.* «Шляхта» – «магнаты» – «элита» Великого Княжества Литовского: к концептуализации понятий в историографии // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1. – 2019. – Т. 11. – № 1. – С. 30–40.

[2] *Аніпяркоў, В. В.* Два далучэнні Міхала Клеафаса Агінскага да Таргавіцкай канфедэрацыі 1792 года // Беларускі гістарычны часопіс. – 2017. – № 4. – С. 17–28; *Яго ж.* Матэрыялы канфедэрацкіх судоў 1792–1793 гг. у фондах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі: гісторыя фарміравання, склад, перспектывы даследавання // Гістарыяграфія і крыніцы вывучэння гісторыі Беларусі: традыцыі і навацыі: зборнік навуковых артыкулаў. – Мінск: Беларуская навука, 2018. – С. 188–194; *Булаты, П. Ю.* Месца ганаровых тытулаў у сацыяльнай структуры Вялікага Княства

Літоўскага XVI–XVIII ст. // Государства Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе: сборник научных статей по материалам III Международной научной конференции, Пинск, 30 ноября – 1 декабря 2018 г. – Пинск: ПолесГУ, 2018. – Вып. 3. – С. 71–74; *Веремейчик, А. Е.* Статут Великого Княжества Литовского 1588 года как источник о частном землевладении на территории Беларуси // Статут Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага 1588 г.: да 430-годдзя выдання: зборнік навуковых артыкулаў па матэрыялах канферэнцыі, Мінск, 19–20 кастрычніка 2018 г. – Мінск: БДУ, 2018. – С. 174–178; *Галубовіч, В. У.* Каралеўскія паслы на сойміку Полацкага ваяводства: часы Жыгімонта і Уладзіслава Вазаў // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: электрон. зб. навук. арт. IV Міжнар. навук. канф. да 50-годдзя Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, Полацк, 19–20 красавіка 2018 г. – Наваполацк: Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, 2018. – С. 389–396; *Яго ж.* Паслы Вялікага Княства Літоўскага на соймах Рэчы Паспалітай у 1633–1647 гг. у адлюстраванні гістарыяграфіі і крыніц // Гістарычна-археалагічны зборнік. – Вып. 33. – Мінск: Беларуская навука, 2018. – С. 165–167; *Яго ж.* Стаўленне шляхты Вялікага Княства Літоўскага да асобы манарха і інстытута манархіі ў час праўлення Уладзіслава Вазы // Беларускі гістарычны часопіс. – 2018. – № 8. – С. 3–10; *Ганчарэнка, С. А.* Сенатарскія роды Вялікага Княства Літоўскага ў 1566–1605 гг.: склад і структура // Studia Historica Europae Orientalis = Исследования по истории Восточной Европы: науч. сб. – Вып. 10. – Минск: РИВШ, 2017. – С. 104–123; *Gordziejew, J.* Wokół genezy administracji lokalnej w Wielkim Księstwie Litewskim: uwagi i propozycje // Rocznik Lituanistyczny. – T. 3. – Warszawa: Komisja Lituanistyczna przy Komitecie Nauk Historycznych PAN, 2017. – S. 183–222; *Дамарад, А. А.* Зямельныя пажалаванні 14–16 ст. як фактар зацверджання ў дваранстве // Общественные и гуманитарные науки: тезисы докладов 82-й научно-технической конференции профессорско-преподавательского состава, научных сотрудников и аспирантов (с международным участием), Минск, 1–14 февраля 2018 г. – Минск: БГТУ, 2018. – С. 16–17. *Яго ж.* Эвалюцыя правоў і прывілеяў шляхты Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XIV – пачатку XVI ст. // Труды БГТУ. Серия 6. – 2017. – № 1. – С. 15–19; *Доўнар, А. Б.* Рэформа кіравання горада і вёскі канца XVIII ст. у прыватных уладаннях (на прыкладзе маёнткаў Францішка Сапегі ў Заходняй Беларусі) // Studia Historica Europae Orientalis = Исследования по истории Восточной Европы: науч. сб. – Вып. 10. – Минск: РИВШ, 2017. – С. 147–200; *Кананові́ч, У. І.* Рыцар на полі бітвы. Клецк, жнівень 1506 года: гісторыка-антрапалагічнае даследаванне. – Смаленск: Інбелкульт, 2017. – 410 с; *Кежа, Ю. М.* Улада князя і баярства ў Полацкай зямлі ў пачатку XI ст. // Научные труды Республиканского института высшей школы. – Вып. 17. – Ч. 1. – Минск: РИВШ, 2017. – С. 153–159; *Латушкін, А. М.* Феномен захоўвання актаў дзяржаўнага архіва Вялікага Княства Літоўскага ў прыватных зборах кіруючай эліты // Беларускі гістарычны часопіс. – 2018. – № 7. – С. 29–42; *Мацук, А. У.* Браслаўскія соймікі ў другой палове 1730-х–1740-я гг. // Архіварыус. – Вып. 16. – Мінск: НГАБ, 2018. – С. 226–239; *Яго ж.* Віцебскія пасольскія соймікі ў панаванне Аўгуста III у 1735–1763 гг. // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А: Гуманитарные науки. – 2019. – № 1. – С. 121–128; *Яго ж.* Выбары Сапегаў пасламі на сойм у панаванне Аўгуста III // Архіварыус. – Вып. 15. –

Мінск: НГАБ, 2017. – С. 257–272; *Яго ж.* Палітычная пазіцыя перадканвакацыйных соймікаў ВКЛ у 1733 г. // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2017. – № 2. – С. 41–52; *Яго ж.* Палітычныя пазіцыі пераканвакацыйных соймікаў ВКЛ у 1733 г. // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2017. – № 2. – С. 41–52; *Яго ж.* Паслы з ВКЛ на сойм Рэчы Паспалітай 1735 г. // Гістарычна-археалагічны зборнік. – Вып. 32. – Мінск: Беларуская навука, 2017. – С. 118–126; *Яго ж.* Рэчыцкі грамнічны соймік у 1736–1763 гг. // Рэчыцкі край: да 150-годдзя з дня нараджэння Мітрафана Доўнара-Запольскага: зб. навук. арт. – Мінск: Беларуская думка, 2019. – С. 293–304; *Яго ж.* Рэчыцкія павятовыя соймікі ў бескаралеўе 1764 г. // Известия Гомельского государственного университета имени Ф. Скорины. – 2018. – № 4. – С. 48–55; *Яго ж.* Фінансава-арганізацыйнае забеспячэнне дзейнасці павятовых соймікаў ВКЛ 1756–1757 гг. // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2019. – № 1. – С. 56–67; *Новаш, В. В.* Шчорсы як эканамічны феномен XVIII стагоддзя // «Долгий XIX век» в истории Беларуси и Восточной Европы: исследования по Новой и Новейшей истории: сб. науч. тр. – Вып. 2. – Минск: РИВШ, 2018. – С. 81–84; *Падалінскі, У. А.* «Гвалтовным обычаемъ въ именью моемъ Поболовскомъ подле реки Добосны». Адзін эпізод з жыцця Рэчыцкага краю XVI ст. // Беларускі гістарычны часопіс. – 2017. – № 12. – С. 17–22; *Яго ж.* Персанальны склад і дзейнасць дэлегацыі Вялікага Княства Літоўскага на Люблінскім сойме 1569 г. // Беларускі гістарычны часопіс. – 2019. – № 7. – С. 3–15; *Яго ж.* Прадстаўніцтва Вялікага Княства Літоўскага на Люблінскім сойме 1569 года: удзел у працы першага вальнага сойма Рэчы Паспалітай. – Мінск: А. М. Янушкевіч, 2017. – 240 с.; *Яго ж.* Сацыяльная біяграфія ўдзельніка Люблінскага сойма 1569 г.: Пётр Кісель і Цімафей Гурка // Журнал Белорусского государственного университета. История. – 2019. – № 2. – С. 10–21; *Яго ж.* Станаўленне інстытута Галоўнага сойміка Вялікага Княства Літоўскага // Статут Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага 1588 г.: да 430-годдзя выдання: зборнік навуковых артыкулаў па матэрыялах канферэнцыі, Мінск, 19–20 кастрычніка 2018 г. – Мінск: БДУ, 2018. – С. 80–85; *Радаман, А. А.* Сістэматызацыя права ВКЛ і пытанне паправы Трэцяга статута ВКЛ на сойміках Навагародскага ваяводства ў 1587–1632 гг. // Журнал Белорусского государственного университета. История. – 2018. – № 2. – С. 21–31; *Рыбчонак, С. А.* Бітва на Вядрошы 1500 г.: рэальныя і міфічныя ўдзельнікі // Ваенныя трыумфы эпохі Вялікага Княства Літоўскага: зборнік навуковых артыкулаў. – Мір: Музей «Замкавы комплекс “Мір”», 2018. – С. 7–45; *Уваров, И. Ю.* Вассальная служба феодалов ВКЛ и их борьба за сохранение своего сословного иммунитета в XV–XVI веках // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А: Гуманитарные науки. – 2017. – № 1. – С. 77–81; *Его же.* Противоречия в среде бояр-шляхты, их ответственность перед законом и характер отправления военной службы в первой половине XVI в. // Романовские чтения–12: сборник статей Международной научной конференции, Могилев, 23–24 ноября 2016 г. – Могилев: МГУ имени А. А. Кулешова, 2017. – С. 62–63; *Его же.* Сословные права и привилегии шляхты Великого Княжества Литовского (конец XIV – конец XVI столетий). – Гомель: Гомельский государственный технический университет, 2017. – 276 с.; *Šałanda, A.* Sąd grodzki grodzieński za czasów Wazów (1587–1668): stan badań i źródła // Rocznik Lituanistyczny. – T. 3. – Warszawa: Komisja Lituanistyczna

przy Komitecie Nauk Historycznych PAN, 2017. – S. 47–80; *Якубаў, В. У.* Кліентэла Льва Сапегі ў Полацкім і Віцебскім ваяводстве ў канцы XVI – пачатку XVII ст. // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: электрон. зб. навук. арт. IV Міжнар. навук. канф. да 50-годдзя Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, Полацк, 19–20 красавіка 2018 г. – Навапалацк: Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, 2018. – С. 434–444.

[3] *Глінскі, Я. С.* Фальсіфікацыі дакументаў аб дваранстве ў Слуцкім павеце Мінскай губерні ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. // Беларускі гістарычны часопіс. – 2018. – № 5. – С. 24–34; *Дамарад, А. А.* Абвастрэнне шляхецкага пытання ў Беларусі пасля паўстання 1830–31 гг. // Общественные и гуманитарные науки: материалы докладов 83-й научно-технической конференции профессорско-преподавательского состава, научных сотрудников и аспирантов (с международным участием), Минск, 4–15 февраля 2019 г. – Минск: БГТУ, 2019. – С. 35–37; *Яго ж.* Сацыяльна-прававы статус носьбітаў дваранскіх тытулаў Рэчы Паспалітай у канцы XVIII – сярэдзіне XIX ст. // Труды БГТУ. Серия 6. – 2018. – № 1. – С. 16–20; *Долгач, Т. В.* Имение Паскевичей в период аграрной реформы: создание и деятельность новой системы управления деревней // Туркманчайский мирный договор: к 190-летию события: сборник научных статей. – Гомель: ГГУ, 2018. – С. 127–134; *Жытко, А. П.* Зямельныя канфіскацыі і падатковая палітыка самадзяржаўя ў дачыненні да паместнага дваранства Беларусі (1863–1914 гг.) // 1917 год в исторических судьбах народов Беларуси: материалы Международной научно-теоретической конференции, г. Минск, 22 декабря 2017 г. – Минск: БГПУ, 2017. – С. 186–190; *Яго ж.* Уплыў палітыкі самадзяржаўя на мабілізацыю дваранскай зямельнай уласнасці ў Беларусі (другая палова XIX – пачатак XX ст.) // Историческая германистика: актуальные проблемы современных исследований: сборник научных статей и материалов. – Псков: Логос, 2018. – С. 262–273; *Игнатьева, А. А.* Дворянство Витебской губернии в составе пронаполеоновской администрации в период военной кампании 1812 года // Научные труды Республиканского института высшей школы. – Вып. 19. – Ч. 1. – Минск: РИВШ, 2019. – С. 148–154; *Каралёнак, У. У.* Нясвіжская ардынацыя Радзівілаў (1870–1914 гг.): сацыяльна-эканамічнае развіццё і трансфер тэхналогій // Беларускі гістарычны часопіс. – 2018. – № 7. – С. 43–50; *Карпечанка, Г. А.* Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх маёнткаў Тышкевічаў у XIX – пачатку XX стагоддзя // «Долгий XIX век» в истории Беларуси и Восточной Европы: исследования по Новой и Новейшей истории: сб. науч. тр. – Вып. 1. – Минск: РИВШ, 2017. – С. 174–186; *Ковшик, Ю. Л.* Внутрисословный состав дворянства Беларуси в конце XVIII в. // 1917 год в исторических судьбах народов Беларуси: материалы Международной научно-теоретической конференции, г. Минск, 22 декабря 2017 г. – Минск: БГПУ, 2017. – С. 200–203; *Его же.* Замещение должностей по выборам от дворянства в судебных учреждениях Полоцкой губернии (1776–1796 гг.) // Образование и наука в XXI веке: ежегодный сборник научных трудов БГПУ. – 2018. – Вып. 1. – С. 115–120; *Коровченко, Е. В.* Игуменская шляхта в Сибири: ссыльные за участие в восстании 1863 года. – Минск: Медисонт, 2018. – 709 с.; *Луговцова, С. Л.* К вопросу о землевладении и землепользовании белорусской шляхты в конце XVIII – первой половине XIX в. // Гуманітарна-эканамічны веснік. – 2017. – № 3/4. – С. 45–51;

*Ее же.* Реализация законодательства о дворянских выборах в белорусских губерниях Российской империи // Гуманітарна-эканамічны веснік. – 2018. – № 1/2. – С. 60–66; *Макарэвіч, В. С.* Разбор шляхты ў беларускіх губернях Расійскай імперыі (канец XVIII – XIX ст.). – Мінск: БДУ, 2018. – 312 с.; *Матвейчык, Д. Ч.* Лісты ссыльных удзельнікаў паўстання 1863–1864 гг. у зборах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі // Архіварыус. – Вып. 16. – Мінск: НГАБ, 2018. – С. 101–121; *Міхайлец, М. А.* Раман Фларыяна Чарнышэвіча «Надбярэзінцы» як крыніца вывучэння культуры палякаў Усходняй Беларусі пачатку XX стагоддзя // Беларусь у XIX–XXI стагоддзях: этнакультурныя традыцыі і нацыянальна-дзяржаўныя працэсы: зборнік навуковых артыкулаў. – Гомель: ГДУ, 2017. – С. 196–202*; Радзюк, А. У.* Выпрабаванне радзімай: рэадаптацыя ўдзельнікаў паўстання 1863–1864 гг. пасля вяртання са ссылкі // Архіварыус. – Вып. 16. – Мінск: НГАБ, 2018. – С. 239–254; *Яго ж.* Канфіскацыя маёмасці ўдзельнікаў паўстання 1863–1864 гг.: гісторыка-юрыдычны аспект праблемы // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. – Серыя 1. – 2018. – Т. 10. – № 1. – С. 22–30; *Радзюк, А. У., Матвейчык, Д. Ч.* Сямейныя трагедыі: прымусовая дэпартацыя ўдзельнікаў паўстання 1863 года ў Сібір // Białoruskie Zeszyty Historyczne = Беларускі гістарычны зборнік. – Z. 49. – Białystok, 2018. – S. 87–101; *Серак, Е. В.* Источники по истории ссылки в Сибирь участников восстания 1863–1864 гг. // Беларускі археаграфічны штогоднік. – Вып. 18. – Мінск: БелНДІДАС, 2017. – С. 75–87; *Ее же.* Нарративные источники в реконструкции повседневной жизни ссыльных участников восстания 1863–1864 гг. в Сибири // Беларускі археаграфічны штогоднік. – Вып. 19. – Мінск: БелНДІДАС, 2018. – С. 61–67; *Ее же.* Ссыльные участники восстания 1863–1864 гг. уроженцы Беларуси в Сибири: численность, сословный состав и география расселения // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А: Гуманитарные науки. – 2018. – № 1. – С. 59–66; *Снапкоўскі, Ю. М.* Мінскі губернатар Валерый Чарыкаў і яго акружэнне ў святле дакументаў фамільнага архіва Чарыкавых // Беларускі гістарычны часопіс. – 2018. – № 5. – С. 49–58; *Талмачова, С. А.* Дзейнасць органаў мясцовага кіравання па пазямельным уладкаванні сельскіх вечных чыншавікоў на тэрыторыі Беларусі (1886–1914 гг.) // Весці БДПУ. Серыя 2. – 2018. – № 4. – С. 13–20; *Толмачева, С. А., Ковшик, Ю. Л.* Институт предводителей дворянства на территории Беларуси в период правления Екатерины II (1772–1796 гг.) // Весці БДПУ. Серыя 2. – 2017. – № 2. – С. 80–87; *Токць, С. М.* Мясцовая шляхта і дзяржаўная адміністрацыя Расійскай імперыі ў Гродзенскай губерні: лаяльнасць і супраціў. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2019. – 384 с.; *Шимукович, С. Ф.* Белорусские региональные элиты периода «Долгого XIX века» как предмет исторического исследования: обоснование понятия // «Долгий XIX век» в истории Беларуси и Восточной Европы: исследования по Новой и Новейшей истории : сб. науч. тр. – Минск: РИВШ, 2017. – С. 3–12; *Его же.* К вопросу об идентичностях элит белорусских земель в период «долгого XIX века»: проблема концептуализации // «Долгий XIX век» в истории Беларуси и Восточной Европы: исследования по Новой и Новейшей истории: сб. науч. тр. – Вып. 2. – Минск: РИВШ, 2018. – С. 167–176; *Шидловский, С. О.* Инвентарная опись имения Экимания (1846–1848) как источник для изучения хозяйственной культуры дворянства Полотчины 40-х гг. XIX в. // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: электрон. зб. навук. арт. IV Міжнар. навук. канф.

да 50-годдзя Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, Полацк, 19–20 красавіка 2018 г. – Наваполацк: Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, 2018. – С. 470–540.

[4] *Башков, А. А.* Становление археологии шляхетских усадеб и резиденций Беларуси в XX в. // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1. – 2019. – Т. 11. – № 1. – С. 18–29; *Его же.* Шляхетские резиденции Брестчины в свете археологических исследований: Ружаны, Скоки, Коссово, Закозель: монография. – Брест: БрГУ, 2017. – 287 с.; *Булаты, П. Ю.* Ляхавіцкая фартэцыя як рэзідэнцыя магнатаў у XVI–XVIII ст. // Социально-гуманитарные знания: материалы XVI Респуб. науч. конф. мол. уч. и аспирантов, Минск, 29 ноября 2017 г. – Минск: РИВШ, 2017. – С. 13–16; *Яго ж.* Ляхавіцкі маёнтак у часы Барбары Радзівіл // Acta anniversaria: зборнік навуковых прац Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж». – Т. 3. – Нясвіж: НГКМЗ «Нясвіж», 2017. – С. 172–176; *Варабей, Т. П.* Сямейнае жыццё Радзівілаў паводле французскай перыёдыкі канца XIX – пачатку XX ст. // Acta anniversaria: зборнік навуковых прац Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж». – Т. 3. – Нясвіж: НГКМЗ «Нясвіж», 2017. – С. 71–88; *Волкаў, М. А.* Забеспячэнне ўзбраеннем і боепрыпасамі рэзідэнцый Радзівілаў у XVI– пачатку XVIII ст. // Acta Anniversaria: зборнік навуковых прац Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж». – Т. 4. – Нясвіж: НГКМЗ «Нясвіж», 2018. – С. 6–34; *Ганчарэнка, С. А.* Шлюбныя стратэгіі ў родзе Радзівілаў у канцы XV – першай палове XVII ст. // Acta anniversaria: зборнік навуковых прац Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж». – Т. 3. – Нясвіж: НГКМЗ «Нясвіж», 2017. – С. 9–21; *Голубева, И. В.* К вопросу о традициях дворянского воспитания на Белорусском Подвинье в первой половине XIX в. (по материалам М. Маркса) // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: электрон. зб. навук. арт. IV Міжнар. навук. канф. да 50-годдзя Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, Полацк, 19–20 красавіка 2018 г. – Наваполацк: Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, 2018. – С. 560–565; *Игнатьева, А. А.* Образовательный уровень дворянства Беларуси в составе офицерского корпуса российской армии в период военной кампании 1812 года // Социально-гуманитарное знание: материалы XV Республиканской научной конференции молодых ученых и аспирантов, Минск, 29 ноября 2018 г. – Минск: РИВШ, 2018. – С. 36–41; *Каралёнак, У. У.* Жанчыны роду Радзівілаў– арыстакраткі Аўстрыйскай імперыі XIX– пачатку XX ст. // Acta anniversaria: зборнік навуковых прац Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж». – Т. 3. – Нясвіж: НГКМЗ «Нясвіж», 2017. – С. 54–70; *Карпечанка, Г. А.* Магнацкі род Тышкевічаў і ўдзел яго прадстаўнікоў у рэлігійным жыцці беларускіх зямель у канцы XV – першай палове XIX ст. // Научные труды Республиканского института высшей школы. – Вып. 17. – Ч. 1. – Минск: РИВШ, 2019. – С. 142–153; *Климов, С. М.* К истории имения Ястрембель. Синергетика белорусской частновладельческой усадьбы XV–XX вв. // Acta anniversaria: зборнік навуковых прац Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж». – Т. 3. – Нясвіж: НГКМЗ «Нясвіж», 2017. – С. 188–196; *Клімаў, І. П.* Класавае маўленне беларускай і ўкраінскай шляхты XVI–XIX стст. // Научные чтения, посвященные Виктору Владимировичу Мартынову: сборник научных трудов. – Минск: Республиканский институт высшей школы, 2017. – Вып. 5. – С. 197–205; *Кур'яновіч, Ю. У.*

Старасвецкая Лошыца. – Мінск: Беларусь, 2018. – 127 с.; *Луговцова, С. Л.* К вопросу о брачной структуре белорусской шляхты в первой четверти XIX в. // Гістарыяграфія і крыніцы вывучэння гісторыі Беларусі: традыцыі і навацыі: зборнік навуковых артыкулаў. – Мінск: Беларуская навука, 2018. – С. 112–119; *Мізярска, Н. А.* Дабрачынная і асветніцкая дзейнасць шляхты Лепельскага павета ў XIX – пачатку XX ст. // Из истории науки Беларуси: к 25-летию исторического факультета БрГУ им. А. С. Пушкина: сборник материалов Международной научно-практической конференции, Брест, 25–26 ноября 2016 года. – Брест: БрГУ, 2018. – Ч. 1. – С. 185–187; *Ее же.* Культура дворянского сословия Витебской губернии в мемуарных источниках XX века // Актуальные проблемы источниковедения: материалы V Междунар. науч.-практ. конф. к 110-летию Витебской ученой архивной комиссии, Витебск, 25–27 апреля 2019 г. – Витебск: ВГУ им. П. М. Машерова, 2019. – С. 255–258; *Рыбчонак, С. А.* Князі Радзівілы і Стваловіцкі касцёл // Acta anniversaria: зборнік навуковых прац Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж». – Т. 3. – Нясвіж: НГКМЗ «Нясвіж», 2017. – С. 177– 187; *Сініла, А. М.* Партрэты Ельскіх і Манюшак са збору Беларускага дзяржаўнага музея, гісторыя паходжання і лёс // Acta Anniversaria: зборнік навуковых прац Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж». – Т. 4. – Нясвіж: НГКМЗ «Нясвіж», 2018. – С. 192–202; *Яго ж.* Партрэты князёў Радзівілаў са збору Беларускага дзяржаўнага музея // Acta Anniversaria: зборнік навуковых прац Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж». – Т. 4. – Нясвіж: НГКМЗ «Нясвіж», 2018. – С. 185–191; *Скепьян, А. А.* Инвентарь 1657 г. художественного собрания князей Радзивиллов // Гістарычна-археалагічны зборнік. – Вып. 33. – Мінск: Беларуская навука, 2018. – С. 185–196; *Яе ж.* Пахаванне Януша Радзівіла – трыумф ці pompa funebris // Ваенныя трыумфы эпохі Вялікага Княства Літоўскага: зборнік навуковых артыкулаў. – Мір: Музей «Замкавы комплекс “Мір”», 2018. – С. 141–148; *Сліж, Н. У.* Эфектыўнасць нормаў сямейнага права ў судовай практыцы ВКЛ у XVI ст. (на прыкладзе шляхецкага шлюбу) // Совершенствование механизма реализации права как условие обеспечения эффективности общественных отношений и защиты национальных интересов Республики Беларусь: научно-методологический семинар, 1 декабря 2017 г. – Гродно: БИП – Институт правоведения, 2018. – С. 20–24; *Словік, С. У.* Музыкальная культура шляхецкай сядзібы Гродзеншчыны XIX ст. // Актуальные проблемы мировой художественной культуры: сборник научных статей: материалы VIII Международной научной конференции, посвященной памяти профессора У. Д. Розенфельда. – Гродно: ГрГУ, 2017. – Ч. 1. – С. 74–77; *Стахно, Н. В.* Асэнсаванне жыцця і смерці ў менталітэце беларускай шляхты XVI стагоддзя // Научные труды Республиканского института высшей школы. – 2017. – Вып. 17. – Ч. 2. – С. 24–31; *Яе ж.* Стаўленне беларускай шляхты XVI–XVII стагоддзяў да жыцця і смерці згодна з іх тэстаментамі // Религия и общество – 11: сборник научных статей. – Могилев: МГУ имени А. А. Кулешова, 2017. – С. 32–34; *Яе ж.* Сямейныя адносіны шляхты беларускіх земляў у канцы XVI–XVIII стст. праз прызму танаталагічных уяўленняў // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А: Гуманитарные науки. – 2018. – № 9. – С. 64–68; *Уласевіч, Р. М.* Культура жыццезабеспячэння шляхты Вялікага Княства Літоўскага XVIII ст. (на прыкладзе роду Яленскіх) // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі. – Вып. 22. – Мінск: Права і эканоміка, 2017. – С. 395–400; *Яго ж.*

Паўсядзённае жыццё аканома ў 2-й палове XVIII ст. // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі. – Вып. 25. – Мінск: Права і эканоміка, 2018. – С. 215–220; *Яго ж.* Рэестр грашовых затрат на сейм 1764 г. з Асабістага архіва Зібергаў-Плятэраў як крыніца па паўсядзённай культуры шляхты XVIII ст. // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: электрон. зб. навук. арт. IV Міжнар. навук. канф. да 50-годдзя Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, Полацк, 19–20 красавіка 2018 г. – Наваполацк: Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, 2018. – С. 617–621; *Яго ж.* Штодзённы побыт шляхты Вялікага Княства Літоўскага ў XVIII ст. // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі. – Вып. 24. – Мінск: Права і эканоміка, 2018. – С. 351–357; *Цыркун, О. Г.* Влияние рода Аскерок на историю создания кафедрального собора Архангела Михаила в г. Мозыре // 1917–2017 гг.: православие в истории и культуре Беларуси – опыт столетия: материалы III Туровских епархиальных образовательных чтений, г. Мозырь, 26–27 октября 2016 г. – Мозырь: МГПУ, 2017. – С. 143–145; *Шимукович, С. Ф.* Региональные элиты Витебска в реализации общественных благотворительных проектов на рубеже XIX–XX веков // Актуальные вопросы изучения и преподавания истории, социально-гуманитарных дисциплин и права: материалы Международной научно-практической конференции к 100-летию исторического факультета ВГУ им. П. М. Машерова. – Витебск: ВГУ им. П. М. Машерова, 2018. – С. 217–220; *Его же.* Участие белорусских региональных элит в реализации благотворительных инициатив через деятельность местных учреждений Российского общества Красного Креста в конце XIX – начале XX века // Научные труды Республиканского института высшей школы. – Вып. 17. – Ч. 2. – Минск: РИВШ, 2017. – С. 108–116; *Шыдлоўскі, С. А.* Педагагічныя традыцыі памеснага дваранства Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.) // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі. – Вып. 25. – Мінск: Права і эканоміка, 2018. – С. 238–243; *Яго ж.* Традыцыі мемарыялізацыі мінулага ў культуры памеснага дваранства Беларусі (канец XVIII – пачатак XX стагоддзя) // «Долгий XIX век» в истории Беларуси и Восточной Европы: исследования по Новой и Новейшей истории: сб. науч. тр. – Вып. 2. – Минск: РИВШ, 2018. – С. 163–166; *Яго ж.* Тэарэтычныя падставы выхавання ў дваранскіх памешчыцкіх сем'ях Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.) // Научные труды Республиканского института высшей школы. – Вып. 19. – Ч. 2. – Минск: РИВШ, 2019. – С. 130–136; *Чараўко, В. У.* Тэстаменты як крыніца па пахавальных традыцыях шляхты і мяшчан Полацкага і Віцебскага ваяводстваў XVI–XVII стст. // Актуальные проблемы источниковедения: материалы V Междунар. науч.-практ. конф. к 110-летию Витебской ученой архивной комиссии, Витебск, 25–27 апреля 2019 г. – Витебск: ВГУ им. П. М. Машерова, 2019. – С. 192–194.

[5] *Анищенко, Е. К.* Шляхта Браславского повета: список XVIII ст. – Минск: Виктор Хурсик, 2018. – 233 с.; *Его же.* Шляхта Гродненского повета: список XVIII ст. – Минск: Виктор Хурсик, 2018. – 302 с.; *Его же.* Шляхта Новогрудского воеводства: список XVIII ст. – Минск: Виктор Хурсик, 2017. – 217 с.; *Афанасьева, Т. Ю.* Архивный фонд рода Слизеней // Беларускія архівы на мяжы тысячагоддзяў: здабыткі і страты: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 80-годдзю Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (Мінск, 28 чэрвеня 2018 г.). – Мінск:

